БЕЛАРУСЫ ЎСЁ БОЛЬШ ЗАХАПЛЯЮЦЦА БЕЛАРУССЮ 3

ДАЖДЖЫ, НАВАЛЬНІЦЫ І ЗНОЎ ДАЖДЖЫ 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

30 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 124 (30004)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Уся сацыяльная сфера знаходзіцца ў полі зроку ўрада, профільных міністэрстваў. Інфармацыю аб тым, як працуюць нашы дзіцячыя лагеры, мы пастаянна заслухоўваем. Актуалізавана тэма па ўстановах аховы здароўя. Даручэнні даваліся кіраўніком дзяржавы па навядзенні парадку. І мы ўсе разам (мясцовая ўлада, урачэбная супольнасць) павінны вывесці на зададзеныя параметры нашу медыцыну».

КАРАТКА

- **Больш за 120 кантрактаў заключылі прадпрыемствы Віцебскай вобласці на Х Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**
- Памятны знак ахвярам генацыду адкрылі на станцыі Баранавічы-Цэнтральныя.

- **Тавараабарот Беларусі і Кітая за студзень-май дасягнуў $3,72 млрд.**
- Георгій Кандрацьеў пакідае пасаду галоўнага трэнера футбольнай зборнай Беларусі.
- **ЦТ па матэматыцы на 100 балаў напісалі 157 абітурыентаў.**

ISSN 1990 — 763X

Будаўнікі Шэлесты

Браты Іван і Аляксандр ШЭЛЕСТЫ працуюць на рэканструкцыі рэспубліканскай дарогі Р-53, яны цесляры-бетоншчыкі. Іван — брыгадзір брыгады ПМК-1 Мінскага трэста № 8, Аляксандр — у падпарадкаванні ў брата. На будоўлі дарогі брыгада ўзводзіць маналітны тунэль для праезду сельскагаспадарчай тэхнікі. Працуюць вахтавым метадам. Іван прыязджае з Акцябрскага, Аляксандр — з Пінска. Родам з Палесся — з вёскі Гарадная Столінскага раёна. Болей за дзесяць гадоў Шэлесты на будоўлях. Апошнім часам шчыруюць на важным дарожна-будаўнічым праекце каля спадарожніка Мінска — Смалявіч.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Запрашальнік

СЯБРЫ, ЗБІРАЙЦЕСЯ НА СВЯТА!

Чым будзе адметнае сёлетняе Купалле ў Александрыі

У Купалля, гэтак любімага беларусамі, ёсць традыцыі не толькі старадаўнія, але і тыя, што з'явіліся ў наш час. Сярод іх — штогадовае святкаванне ў гарадку Александрыя Шклоўскага раёна, на беразе ракі Днепр. Сёлета рэспубліканскае свята «Купалле. Александрыя збірае сяброў» пройдзе 8 ліпеня. Якія цікавосткі чакаюць гасцей, расказалі ў прэс-цэнтры Дома прэсы.

СТАР. 3

Відавочца Перамогі

Сумесны праект «Звязды» з Магілёўскай абласной арганізацыяй ветэранаў

«У нямецкім палоне мяне выратавала толькі гарачая малітва»

Вязень вайны Браніслава КАЗАКЕВІЧ дагэтуль не можа забыць той жах, які перажыла

Яна расказвае пра сваю маладосць так падрабязна, быццам гэта было толькі ўчора, а не 80 гадоў таму. Вайна прыпыніла мірнае жыццё ў вёсцы Дубраўка, што на Шклоўшчыне, калі Браніславе Іванаўне было 16 гадоў. Кажа, што апошнім часам, калі застаецца адна, гэтыя ўспаміны пераварочваюць усю яе душу. І зноў яна перажывае той страшэнны жах, калі яе з дзвюма сяброўкамі немцы схапілі ў лесе, закінулі ў машыну і кудысьці павезлі. Памятае, як ад той невядомасці, што яна адчувала, сэрца, здавалася, разарвецца на кавалачкі. Тады яна яшчэ і ўявіць сабе не магла, наколькі доўгім і складаным будзе яе жыццё.

СТАР. 4

«МОЦНЫ ПРЭЗІДЭНТ, УПЛЫВОВЫ ПАРЛАМЕНТ...»

Прававая формула вызначана ў Беларусі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 28 чэрвеня падпісаў Указ № 196, якім зацверджана Канцэпцыя прававой палітыкі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Структураваны ў пяці раздзелах дакумент вызначае стратэгію развіцця ўсёй прававой сістэмы краіны, якая ў сучасных умовах павінна не проста рэгуляваць грамадскія адносіны, але і папярэджваць магчымыя выклікі і пагрозы. У рамках канцэпцыі вызначаюцца паняцце прававой палітыкі Беларусі, яе мэты, прынцыпы, а таксама суб'екты: «Прававая палітыка — навукова абгрунтаваная дзейнасць дзяржавы пры ўдзеле грамадзян, грамадскіх інстытутаў па фарміраванні і развіцці ўсіх элементаў прававой сістэмы».

У дакуменце замацоўваюцца нацыянальныя гісторыка-культурныя асновы прававой сістэмы, прасочваецца эвалюцыйны шлях яе станаўлення: «На працягу ўсёй сваёй гісторыі краіне неаднаразова даводзілася адстойваць незалежнасць, забяспечваць бяспеку па перыметры граніц, аказваць дапамогу як цэлым дзяржавам, так і асобным групам насельніцтва. Дадзеныя працэсы адбіліся на менталітэце беларусаў, характар якіх заўсёды адрознівалі талерантнасць, стваральнасць, непрыняцце агрэсіі і ціску звонку. Важна захаваць і прымнажыць гэтыя найлепшыя якасці беларускага народа». «Сёння Рэспубліка Беларусь — гэта дзяржава, пабудаваная на трывалым падмурку агульначалавечых каштоўнасцяў, якая імкнецца да мірнага суіснавання, канструктыўнага дыялогу і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі і рэгіёнамі, што знаходзіць адлюстраванне ў Нацыянальным праве», — гаворыцца ў канцэпцыі.

У дакуменце замацоўваюцца ідэалагічныя імператывы, якія выступаюць падмуркам прававой палітыкі. Дзяржаўны суверэнітэт і тэрытарыяльная цэласнасць з'яўляюцца ключавымі. На іх аснове рэалізоўваюцца астатнія — нацыянальная бяспека, народаўладдзе, сацыяльная справядлівасць і іншыя. Будзе абаронены канстытуцыйны лад — будуць абаронены інтарэсы грамадзян. Таксама ў канцэпцыі прадугледжваюцца прыярытэтныя напрамкі развіцця галін заканадаўства. У сферах заканадаўства аб абароне і нацыянальнай бяспекі трэба ўзмацніць абарону інфармацыйнага суверэнітэту краіны, распрацоўваць наднацыянальныя стандарты і правілы ў галіне інфармацыйнай бяспекі з акцэнтам на прасоўванне нацыянальных прававых інтарэсаў. У сферах грамадзянскага, эканамічнага (гаспадарчага) заканадаўства трэба будзе рэалізоўваць прынцып сацыяльнай адказнасці бізнесу перад дзяржавай, грамадствам і грамадзянамі. У рамках заканадаўства, якое рэгулюе сацыяльную сферу, неабходна зрушыць акцэнты прававога рэгулявання ад заступніцтва дзяржавы да ўстанаўлення партнёрскіх адносін паміж дзяржавай, грамадствам і грамадзянамі. Варта выбудоўваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва, павышаць адказнасць кожнага грамадзяніна за сваё жыццё, здароўе і дабрабыт. У канцэпцыі прававой палітыкі захоўваецца трэнд на ўніфікацыю і кадыфікацыю. Прадугледжана кадыфікацыя заканадаўства ў сферы аховы навакольнага асяроддзя, інвестыцыйнага заканадаўства, а таксама сістэматызацыя заканадаўства ў сферы інтэлектуальнай уласнасці і інш. У адпаведнасці з канцэпцыяй прававая праца будзе будавацца па формуле «моцны прэзідэнт, уплывовы парламент, ініцыятыўны ўрад пры сувязной ролі Усебеларускага народнага сходу». Прымяненне канцэпцыі дазволіць актуалізаваць і накіроўваць усе прававыя працэсы: ад развіцця заканадаўства да навукі і адукацыі.

Урачыстасць

«Магчымасць жыць у суверэннай дзяржаве — найважнейшае дасягненне беларускага народа»

Раман ГАЛОЎЧАНКА ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды

У Палацы Рэспублікі, дзе адбылася ўрачыстая цырымонія, сабраліся найлепшыя прадстаўнікі працоўных калектываў з розных рэгіёнаў Беларусі. Усе яны прадстаўляюць розныя сферы, аднак аб'ядноўвае іх неабыякавасць да сваёй справы, імкненне нават у самых няпростых умовах рэалізоўваць амбіцыйныя праекты, адказна выконваць найскладанейшыя задачы.

Прысутным на ўрачыстай цырымоніі Раман Галоўчанка адрасаваў словы падзякі за працу і адданасць сваёй справе. Ён адзначыў, што, па даручэнні Прэзідэнта Беларусі, заслужаныя дзяржаўныя ўзнагароды будуць уручаны прафесіяналам, чые заслугі і ўклад у развіццё роднай краіны па праве адзначаны дзяржавай.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што асаблівую ўрачыстасць мерапрыемству надае тое, што яно праходзіць напярэдадні галоўнага дзяржаўнага свята — Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. «Гэтае свята сімвалізуе свабоду, сілу і адзінства нашай краіны, — звярнуў увагу кіраўнік урада. — Яно таксама служыць напамінам аб тым, які далікатны мір, як складана здабываецца незалежнасць і як важна яе берагчы. Магчымасць жыць у суверэннай дзяржаве, самастойна вызначаць курс знешняй і ўнутранай палітыкі, зыходзячы з уласных інтарэсаў, — выключная каштоўнасць і найважнейшае дасягненне беларускага народа».

Фота БелТА.

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ўручае медаль «За працоўныя заслугі» начальніку ўпраўлення арганізацыі працы і заработнай платы ААТ «Бабруйскі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў» Наталлі КОРСАКАВАЙ.

Выказваючы словы падзякі за плённую работу прадстаўнікоў самых розных прафесій, прэм'ер-міністр абазначыў асаблівую ролю тых, хто аддана служыць сваёй Айчыне. «Кожны з прысутных у гэтай зале сваёй штодзённай працай уносіць важкі ўклад ва ўмацаванне нашай незалежнасці, — заўважыў ён. — З такіх маленькіх, але вельмі каштоўных «цаглінак» і фарміруецца стабільная, сучасная суверэнная Беларусь, якая ўпэўнена глядзіць у будучыню».

Паводле БелТА.

Сацыяльны вектар

Фонд правоў і гарантый

Сярэдняя пенсія на сёння ў Беларусі складае 676 рублёў і будзе сёлета абавязкова павышацца. Пра гэта паведаміла кіраўнік Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Юлія БЕРДНІКАВА. (1 ліпеня фонд адсвяткуе сваё 30-годдзе.)

Па словах Юлі Берднікавай, у 2022 годзе ў даходы бюджэту фонду паступіла 21,8 мільярда рублёў. Яны не назапашваюцца, а штодзённа накіроўваюцца на выплату пенсій і дапамог. Даходы бюджэту фонду на 90 % складаюцца з абавязковых страхавых узносаў работадаўцаў за працоўных грамадзян. Тарыф, як вядома, складае 35 %, з якіх работнік плаціць 1 %, а 34 % — яго наймальнік.

З расходнай часткі бюджэту фонду каля 77 % накіроўваецца на выплаты пенсій. У 2022 годзе на гэтыя мэты зрасходавана 16,2 мільярда рублёў. Сёлета на гэтыя мэты запланавана 18,8 мільярда. Нагадаем, летась тройчы ажыццяўляўся пералік і павышаліся пенсіі. Летась па выніках года сярэдняя пенсія непрацоўнага грамадзяніна складала 602 рублі 69 капеек. Сёлета пенсіі таксама ўжо аднойчы павышаліся — з 1 мая. На сёння яе сярэдні памер складае 676 рублёў 93 капейкі.

— Разам з тым кіраўнік дзяржавы паставіў задачу ў бягучым годзе падтрымаць пенсіянераў гэтак жа, як і летась. Мы працуем над яе вырашэннем. Сумесна з Міністэрствам фінансаў пралічваем каляндарны план павышэння пенсій. Адназначна будзе павышэнне пенсійных выплат у адносінах дадзенай катэгорыі грамадзян, — заявіла Юлія Берднікава.

Яшчэ адзін від расходнай часткі бюджэту фонду — дапамогі, найперш на падтрымку сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. На гэтыя мэты летась было накіравана 2,9 мільярда рублёў. Самую істотную частку такіх выплат складаюць дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзетак да трох гадоў. На гэта летась накіравана 1,6 мільярда рублёў, сёлета мяркуецца выдаткаваць 1,9 мільярда.

У структуры дапамог важкую частку займае і падтрымка працоўных грамадзян. На аплату бальнічных летась накіравана 1,5 мільярда рублёў, сёлета запланавана выдаткаваць 1,9 мільярда. Штомесяц атрымальнікамі такіх дапамог з'яўляецца каля 280 тысяч часова непрацаздольных грамадзян.

Сёння ў краіне дзейнічае трохузроўневая пенсіённая сістэма. Сацыяльную пенсію атрымліваюць грамадзяне, якія не выпрацавалі мінімальны страхавы стаж. Яе памер складае 50 % бюджэту пражытачнага мінімуму. Асноўная частка пенсіянераў — гэта каля 2 мільёнаў 300 тысяч беларусаў — атрымліваюць працоўныя пенсіі. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы створаны і трэці ўзровень — добравольныя назапашвальныя пенсіі, вядомыя як «3+3». Праграма дзейнічае з 1 кастрычніка 2022 года.

За гэты час дагавор з кампаніяй «Стравіта» заключылі больш за 17 200 грамадзян (яго могуць заключаць працоўныя жанчыны да 55 гадоў і мужчыны да 60 гадоў, бо мэтазгодна рабіць назапашванні не менш за тры гады). Найчасцей праграму добравольнага пенсіённага назапашвання выбіраюць жанчыны — іх каля 70 % сярод тых, хто заключае дагаворы. Большасць (80 %) знаходзяцца ва ўзросце ад 38 гадоў, самы запатрабаваны тарыф — «3+3», яго абралі 65 %. Большасць застрахаваных, а менавіта 93 %, выбіраюць пяцігадовую працягласць выплаты дадатковай пенсіі, 7 % будуць атрымліваць яе цягам 10 гадоў пасля выхаду на заслужаны адпачынак.

Найбольшую цікавасць да праграмы добравольнага назапашвальнага пенсіённага страхавання праяўляюць работнікі ўстаноў адукацыі, аховы здароўя і сацыяльнай абароны, дзяржаўнага кіравання.

Алена КРАВЕЦ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Францыі — масавыя беспарадкі

Прычынай масавых выступленняў стала забойства паліцэйскімі падлетка. 27 чэрвеня, падчас праверкі на дарозе ў Нантэры, паліцэйскі застрэліў 17-гадовага хлопца. Па даных праваахоўнікаў, гэта адбылося пасля таго, як малады чалавек адмовіўся выконваць патрабаванні паліцыянта патруля. Інцыдэнт пацягнуў за сабой беспарадкі адразу ў некалькіх гарадах Францыі. Больш за 150 чалавек былі затрыманыя за ўдзел у беспарадках. Паліцэйскі, які стрэліў у падлетка, змешчаны пад варту па падазрэнні ў наўмысным забойстве. Пракуратура пачала расследаванне здарэння. Як інфармуе ТАСС, падчас падаўлення начных беспарадкаў у Францыі пацярпелі некалькі дзясяткаў праваахоўнікаў. Афіцыйны прадстаўнік МУС Францыі Камаль Шэз адзначыла, што пазамінулай ноччу, нягледзячы на мабілізацыю 2 тысяч паліцэйскіх і жандараў па ўсёй Францыі, «распаўсюджванне насілля было асабліва моцным». Учора было заяўлена аб намеры прыцягнуць да падаўлення беспарадкаў 40 тысяч паліцэйскіх.

Шкоду ад беспарадкаў пакуль не ўдалося ацаніць. Вядома аб дзясятках спаленых аўтамабіляў праваахоўнікаў па ўсёй краіне. У выніку падпалу на паркоўцы згарэў фасад адной са школ, у шэрагу камун быў спалены грамадскі транспарт. Таксама пагромшчыкі падпальвалі паліцэйскія ўчасткі і мэрыі.

Орбан: «У Еўропе — ні міру, ні росквіту»

Прэм'ер-міністр Венгрыі Віктар Орбан заявіў, што Еўрасаюз ствараўся па дзвюх асноўных прычынах. «Па-першае, дзеля міру, а цяпер ідзе вайна. Па-другое, дзеля росквіту, а эканоміка выклікае ўсё большую трывогу. Цяпер у Еўрапейскім саюзе няма ні міру, ні росквіту», — напісаў венгерскі прэм'ер у сваім акаўнце ў «Facebook» перад самітам ЕС.

Саміт праходзіць 29-30 чэрвеня ў Бруселі. На парадку дня — канфлікт ва Украіне, аказанне Кіеву ваеннай дапамогі, спроба мяцяжу ў Расіі, выкарыстанне замарожаных расійскіх актываў.

У Севастопалі знайшлі антычны маўзалей

Спецыялісты Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры РАН знайшлі ўнікальную антычную канструкцыю ў Севастопалі, паведамляецца на сайце адміністрацыі Санкт-Пецярбурга. Яна размешчана на заходнім баку старажытнай вуліцы, якая праходзіць па тэрыторыі гарадскога некропаля ад варот Херсанеса. Верхнюю частку можна аднесці да разраду рытуальнай альтанкі, якая звычайна ладзілася ў месцах асаблівага грамадскага ці культавага значэння на важных вуліцах горада ці некропаля, гаворыцца ў публікацыі. А на ніжнім ярусе — пахавальны комплекс. У ім пахаваны члены сям'і арыстакратаў. Менавіта такое спалучэнне робіць пабудову ўнікальнай для антычнага свету.

СЯБРЫ, ЗБІРАЙЦЕСЯ НА СВЯТА!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА нагадаў, што месца святкавання было абрана невыпадкова. Рака Днепр аб'ядноўвае тры славянскія народы, да таго ж Александрыя — радзіма Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

— Апошнія сем гадоў прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў нашай краіны збіраюцца тут, на Александрыйскім полі. Пра зацікаўленасць людзей гаворыць хаця б той факт, што каля 240 уласнікаў падалі сёлета заяўкі для ўдзелу ў свяце, каб забяспечваць гандаль, харчаванне і г. д. Так што сёння Александрыйскае поле ўжо не змяшчае ўсіх ахвотных. Асноўным сюжэтам сёлетняга свята з'яўляюцца нацыянальныя абрэзгі. А галоўным беларускім абрэзгам у Год міру і стваральнай працы з'яўляецца бусел — кожны рэгіён Беларусі прадставіць сваю трактоўку гэтага сімвала. Ідэю абрэзгаў падхапіла Расійская Федэрацыя, яе ўвасобяць прадстаўнікі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з двух дзясяткаў рэгіёнаў Расіі, якія прывязуць свае самабытныя вырабы. Цяпер на Александрыйскім полі вырастае цэлы горад. Узводзяцца палаткі, сцэнічныя подыумы, анімацыйныя зоны, якія, як чакаецца, прымуць не менш за 70 тысяч чалавек — гэта лічба наведвальнікаў мінулага года. Так што на адзін дзень насельніцтва Шклоўскага раёна падвоіцца, а магчыма, патроіцца.

Важным складнікам стане праграма, арганізаваная Саюзнай дзяржавай. Але цікавасць да свята праяўляе не толькі Расія. Каля 30 дыпламатычных прадстаўніцтваў накіруюць сваіх прадстаўнікоў у Александрыю, дзе традыцыйна адбываецца абмеркаванне і дзелавых пытанняў. Таму свята ў Александрыі — гэта яшчэ і прыклад удалай народнай дыпламатыі.

Валерый Малашка нагадаў пра яшчэ адну своеасаблівую сцэнічную пляцоўку — паветра, у якім адбываюцца дэманстрацыйныя палёты самалётаў, выступленні парашутыстаў. Вялікая ўвага будзе аддадзена моладзі. Гэта і падвядзенне вынікаў Рэспубліканскага конкурсу «Уладар сяла» на найлепшую маладую сям'ю, якая жыве ў вёсцы, і шматлікія спартыўныя спаборніцтвы, інтэрактыўныя пляцоўкі, у тым ліку пляцоўка маладога блогера.

— Каб прадставіць маштаб таго, што адбываецца, уявіце дзесяць футбольных палёў, кожнае з якіх працуе ў сваёй інтэрактыўнай зоне, — сказаў Валерый Анатолевіч.

Пра канцэртную праграму падрабязней распавяла **Ірына ДРЫГА, начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры**.

— У 21.30 на вялікай сцэне пачнецца галоўны канцэрт, ён пройдзе ў фармаце народнага музычнага рынга. Гэта будзе творчае спаборніцтва паміж двума аграгарадкамі-суседзямі — Копыссю і Александрыяй. Іх увасобяць два народныя камедыйныя персанажы — Дзед і Баба. Ролю Бабы, якая ачоліць каманду Александрыі, сыграе мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы Вольга Няфёдава, у ролі Дзеда, які прадставіць каманду Копысі, — папулярны камедыйны артыст і тэлевядучы Уладзімір Варанкоў. Гледачы пасля кожнага нумара прагаласуюць за тую ці іншую каманду. Вядома, спаборніцтва будзе мець жартоўны характар, хаця інтрыга захаваецца да апошняга.

У канцэртах Александрыі можна будзе пабачыць зорак беларускай эстрады Анатоля Ярмоленку, Уладзіміра Правалінскага, Ірыну Дарафееву, Аляксандра Саладуху, Алену Ланскую, Жанэт, Руслана Аляхно і многіх іншых. Будуць і салісты оперы, і харэаграфічныя нумары, і інструментальныя... Многіх артыстаў гледачы пабачаць у нечаканых амплуа. Выступяць і расійскія госці — саліст групы «Зямляне» Сяргей Скачкоў, Надзея Кадышава. Па добрай традыцыі шоу завершыцца святочным феерверкам.

Аляксандр ЖЫГУН, начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама, распавёў пра дзейнасць пляцоўкі Саюзнай дзяржавы — асаблівасць менавіта сёлетняга свята. Будуць прадстаўлены вырабы дзевяці дзясяткаў расійскіх майстроў з дзевятнаццаці рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. У канцэрце выступяць і расійскія, і беларускія артысты. Запланавана яркае адкрыццё пад назвай «Беларусь — абярэг міру». Сярод адметнасцяў сёлетняга свята таксама палявы кінатэатр і тры цыркавыя прадстаўленні.

Асноўную інфармацыю пра свята можна знайсці на сайце Магілёўскай абласной філармоніі. Арганізатары прадумалі лагістыку, графік руху транспарту — аўтобуснага, чыгуначнага. На асноўныя мерапрыемствы білеты ўжо прададзены. Але запланавана візуалізацыя канцэртаў, і кожны, хто будзе прысутнічаць на Александрыйскім полі, убачыць усе нумары на вялікіх экранах, гэтак жа, як трансляцыю спартыўных спаборніцтваў, дзіцячага свята ды іншых мерапрыемстваў. Будзе весціся таксама інтэрнэт-трансляцыя канцэрта Саюзнай дзяржавы.

Арганізатары параілі гасцям свята апрануцца з улікам надвор'я, падумаць пра камфортны абутак, а таксама з разуменнем паставіцца да звычайных для падобных масавых мерапрыемстваў мер бяспекі. Для цяжкіх сумак ды іншых грувасткіх рэчаў гасцей прадугледжаны камеры захоўвання. Зладзяць іх і ўнутры Александрыйскага поля — для пакупак, якія зробяць на кірмашы госці.

Людміла ІВАНОВА.

Шануй сваё

БЕЛАРУСЫ ЎСЁ БОЛЬШ ЗАХАПЛЯЮЦЦА БЕЛАРУССЮ

Дзе і як лічаць за лепшае адпачываць нашы суайчыннікі?

Больш за 90 % беларусаў разглядаюць Беларусь як месца магчымага адпачынку. Каля 30 % нашых суайчыннікаў падарожнічаюць па краіне некалькі разоў на год. А сярод аб'ектаў, якія можна лічыць нашай візітоўкай, беларусы найчасцей называлі Мірскі замак, Брэсцкую крэпасць, Нясвіжскі замак, Белавежскую пушчу, Хатынь, а таксама Мінск, Брэст, Нясвіж, Гродна і Мір. Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук правёў сацыялагічнае апытанне «Турыстычныя перавагі жыхароў Беларусі». Апытанне праводзілася ў першых паўгоддзях 2021, 2022 і 2023 гадоў.

З СЯМ'ЁЙ НА ПРЫРОДЗЕ

Важнай часткай жыцця адпачынак назвалі 73,4 % рэспандэнтаў (у 2021-м гэта лічба была вышэйшай — 87,7 %). Як патлумачыў **намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Мікалай СУХОЦКІ**, пандэмія стала стрэс-тэстам для індустрыі турызму, таму многія хацелі падарожнічаць. А сёлета сітуацыя стабілізавалася.

Сярод спосабаў адпачынку, якім беларусы аддаюць перавагу, найчасцей называлі адпачынак на прыродзе (45,1 %), рыбалку, паляванне, збор ягад і грыбоў (39,2 %), адпачынак на дачы (31,5 %). Таксама сярод папулярных адказаў былі наведванне гістарычных мясцін, адпачынак на пляжы, наведванне прыродных адметных мясцін, храмаў і манастыроў, актыўны адпачынак, культурныя і спартыўныя мерапрыемствы.

Пераважная большасць беларусаў аддае перавагу адпачынку з сям'ёй — 72,6 %. З сябрамі бавяць вольны час 35,4 %, у адзіноце — 11,7 %, з калегамі па працы ці вучобе — 7,4 %. Пры гэтым 70 % апытаных выбіраюць самастойную арганізацыю адпачынку, да тураператараў і агенцтваў звяртаецца 21,5 %. Спыняюцца падчас водпуску беларусы найчасцей у сваякоў (36,4 %), у гасцініцах і атэлях (30,5 %), у арандаваным жыллі (18,1 %), кемпінгах (14,5 %), санаторыях (12,7 %).

ТОП-10 ГАРАДОЎ І СЛАВУТАСЦЯЎ ДЛЯ НАВЕДВАННЯ

Каля 13 % апытаных планавалі сёлета выезд за мяжу. У топ-10 краін для падарожжаў нашых суайчыннікаў увайшлі Расія (42,3 % збіраліся наведаць гэту краіну), Турцыя (11 %), краіны Еўропы (7,9 %), Германія (яе апытаныя часта называлі асобна, 7,1 %), Егіпет (5,6 %), Польшча (5,6 %), Грузія (3,6 %), Іспанія (2,5 %), Аб'яднаныя Арабскія Эміраты (2,3 %), Тайланд (1,9 %).

Усё больш беларусаў арыентуюцца пры выбары месца адпачынку на родную краіну — 91,7 % (у 2021 годзе такіх было 84,5 %). Пры гэтым 7,3 % не разглядаюць Беларусь як месца адпачынку. Іх спыняюць высокія, па іх меркаванні, цэны (37,2 %), мала цікавых і прывабных месцаў (15,9 %), недахоп інфармацыі (13 %), нізкая якасць сэрвісу (6,9 %).

— Беларусы ўсё больш захапляюцца Беларуссю, — каментуе Мікалай Сухоцкі. — У 2021 годзе тых, хто не разглядаў нашу краіну як месца адпачынку, было нашмат больш — 42,7 %.

Некалькі разоў на год па Беларусі падарожнічае каля 30 %, у асноўным гэта моладзь. Пятая частка апытаных не падарожнічала цягам года па краіне. Сярод мэт падарожжа найчасцей называлі наведванне гістарычных і культурных месцаў, сваяцкія візіты і наведванне малой радзімы, наведванне прыродных аб'ектаў, лячэнне і аздараўленне, наведванне мерапрыемстваў, фестываляў, выстаў, рэлігійных аб'ектаў.

У топ-10 рэгіёнаў, па якіх найчасцей падарожнічаюць, па выніках апытання ў 2023 годзе ўвайшлі Брэст, Мінск, Гродна, Нясвіж, Віцебск, Мір, Магілёў, Гомель, Полацк, Браслаў. Гэтыя ж гарады, толькі ў іншай паслядоўнасці, трапілі ў дзясятку месцаў, якія беларусы хацелі б абавязкова наведаць. Яна выглядае так: Брэст, Мінск, Гродна, Віцебск, Гомель, Магілёў, Мір, Нясвіж, Браслаў, Полацк.

А вось што нашы суайчыннікі параілі б сябрам ці гасцям краіны для наведвання: Брэст, Браслаўскія азёры, Нясвіж, Мінск, Гродна, Брэсцкую крэпасць, Мір, Белавежскую пушчу, Нарач, Віцебск. Топ-10 гістарычных аб'ектаў, вартых, па меркаванні апытаных, стаць візітоўкай Беларусі, выглядае так: Мірскі замак, Брэсцкая крэпасць, Нясвіжскі замак, Мінск, Нясвіж, Белавежская пушча, Брэст, Хатынь, Гродна і Мір.

Сярод мерапрыемстваў, якія беларусы хацелі б наведваць, найбольшую цікавасць выклікаюць музычныя конкурсы і фестывалі, а таксама кірмашы, гістарычныя мерапрыемствы, нацыянальныя святы, спартыўныя спаборніцтвы.

АДПАЧЫНАК У САНАТОРЫЯХ ПАКІДАЕ СТАНОЎЧЫЯ ЎРАЖАННІ

Чвэрць апытаных у апошнія пяць гадоў наведвала беларускія санаторыі. З іх 76,1 % задаволены якасцю паслуг. А ў 97,7 % такі адпачынак пакінуў станоўчыя ўражанні. Сярод найлепшых санаторыяў, па ўласных адчуваннях і водгуках сяброў, беларусы называлі здраўніцы «Нарач», «Радон», «Ружанскі», «Прыазёрны», «Прыдняпроўскі», «Белая вежа», «Рассвет-Любань», «Белая Русь», «Буг», «Азёрны».

Што адпачывальнікі хацелі б палепшыць у рабоце санаторыяў? Найперш разнастаіць культурна-масавыя мерапрыемствы. А таксама знізіць цэны, палепшыць харчаванне, абслугоўванне, спартыўны інвентар, пашырыць пералік працэдур, зрабіць больш сучасны рамонт, палепшыць якасць медыцынскіх працэдур і медыцынскую базу.

У цэлым каля 65 % апытаных лічыць, што апошнім часам сфера ўнутранага турызму змянілася ў лепшы бок, прычым найперш гэта датычыцца аздараўленчага сэрвісу. А вось над развіццём пунктаў грамадскага харчавання на турыстычных аб'ектах і па дарозе да іх варта яшчэ папрацаваць. Лячэбна-аздараўленчы турызм беларусы лічаць і найбольш перспектыўным відам. Таксама развіваць варта ваенна-гістарычны і аграэкатурызм. Сярод перспектыўных называлі актыўны і спартыўны, культурна-адукацыйны, пляжны, падзейны, рэлігійны і прамысловы віды турызму.

Апытаныя выказалі меркаванне, што ў нашай краіне варта павялічваць колькасць бюджэтных месцаў для адпачынку, прасоўваць адметныя мясціны ў СМІ, паляпшаць якасць абслугоўвання ў існуючых аб'ектах і павялічваць колькасці новых, развіваць турызм, арыентаваны на мясцовую і рэгіянальную спецыфіку. Якія меры могуць гэтаму спрыяць? Найперш рэстаўрацыя і аднаўленне культурна-гістарычных помнікаў і арганізацыя свят і фестываляў, а таксама развіццё інфраструктуры і пашырэнне сеткі турыстычных маршрутаў і інфармацыі пра іх.

Алена КРАВЕЦ,

«У нямецкім палоне...»

Браніслава КАЗАКЕВІЧ з пляменніцай Зінаідай Іванаўнай і прапраўнукам Цімошам.

«Дзяўчаты, не будзьце дурніцамі, не дакручвайце гайкі...»

Яна ўся такая маленькая і худзенькая, што міжволі хочацца яе абараніць. І нават захапляешся той сілай волі, якая дапамагла гэтай жанчыне пераадолець такія цяжкасці, пра якія нават думаць страшна. З вялікай сям'і, у якой іх было пяцёра дзяцей, яна засталася адна. Сышла з жыцця нават маладзейшая за яе на пяць гадоў Антоська. Дзякуй богу, што пляменніца не кінула ў бядзе, забрала цётку да сябе і клапоціцца пра яе як пра маці.

— Нас у бацькоў было тры дачкі — Ганна, я і Антося, і два сыны — Павел і Бора, — успамінае Браніслава Іванаўна сваё даваеннае дзяцінства. — Тата прыйшоў з фінскай вайны моцна пабіты. Хатку такую-сякую зрабіў, мы там і жылі. З братамі і сёстрамі ўпяцёх спалі на матрацы, напханым саломай. Бацька памёр яшчэ да вайны. А вось браты Павел і Бора ваявалі танкістамі, абодва былі камандзіры. Паўла на Украіне моцна параніла, але яго мясцовыя жыхары выратавалі, і ён выжыў. Так і застаўся жыць на Украіне, у яго пасля вайны сямёра дзетак нарадзілася. А вось малодшы прапаў без вестак. Таксама на Украіне.

Браніслава Іванаўна расказвае, што пра вайну ў яе Дубраўцы даведаліся з рэпрадуктара. Хлапцоў усіх на фронт забралі, жаночы плач стаяў па ўсёй вёсцы. Хутка прыйшлі фашысты. Моладзь хавалася ад чужаземцаў, бо паўналетніх хапалі і вывозілі ў Германію. Аднойчы ў іх лік трапіла і Браніслава з сяброўкамі.

— Мы шчаўе каля лесу збіралі і не адразу ўбачылі, што едуць немцы, — расказвае жанчына. — Яны везлі моладзь на машыне і нас прыкмецілі. Мы за нейкі корч схаваліся, але яны нас, як шчанят, адтуль выцягнулі. Спачатку хацелі расстраляць, а потым пагрузілі на машыну і павезлі ў Оршу.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Праз тыдзень немцы строем пагналі палонных на таварняк. Хлопцаў пасадзілі ў адзін вагон, дзяўчат — у другі. Куды вязуць, ніхто не ведаў. Унутры вагона — сена, замест прыбіральні — дзірка ў падлозе. Кармілі раз у суткі варанай бручкай, нават без вадкасці. Таму ўвесь час хацелася піць. Да Польшчы цягнік ехаў амаль тыдзень, часта прыпыняўся. Нарэшце аб'явілі: прыехалі. Гэта быў яшчэ нямецкі тады горад Лаўбан (цяпер польскі Любань).

Іх прывезлі ў нейкі лагер, абнесены калючым дротам. На тэрыторыі стаяла шэсць баракаў. У тым, куды трапілі Браніслава з сяброўкай, жылі адразу 30 дзяўчат. Замест ложкаў — нары ў тры паверхі. Браніславе дасталася трэцяя паліца.

— Некаторы час мы працавалі ў немца, які меў свой рэстаран, — успамінае яна. — Кармілі той жа бручкай, але яшчэ па два кавалачкі хлеба давалі. А праз два дні пагналі на будоўлю, якая была за Лаўбанам. Хлопцы канавы капалі, а мы на ваганетках вазілі зямлю. Мы з сяброўкай маленькія былі, адну ваганетку ўдзвюх цягалі, а больш дзябёлыя дзяўчаты спраўляліся ў адзіночку. Помню, як адна ад бяссілля ўпала і немец стаў біць яе нагайкай. У дзяўчыны з рота і носа хлынула кроў. Нашы хлопцы не вытрымалі і накінуліся на таго немца. Адабралі нагайку і кудысьці завалаклі. Болей мы яго не бачылі.

Аднойчы ў барак прыйшлі два прыстойна апранутыя немцы і, кіўнуўшы ў бок Браніславы і яе сяброўкі, сказалі, што ім патрэбныя гэтыя «цвай кляйна кіндэр» (два маленькія дзіцяці). Так дзяўчаты трапілі працаваць у горад на фабрыку GEMA, дзе рабілі дэталі для нямецкіх самалётаў.

— Запомніўся ўкраінец, які добра ведаў нямецкую мову і быў там на асаблівым становішчы, — успамінае жанчына. — Ён нам сказаў: «Дзяўчаты, не будзьце дурніцамі, не дакручвайце гайкі. Гэтыя ж самалёты паляцець забіваць нашых». Ну мы і не дакручвалі. Аднойчы гэта ўбачыў немец і так балюча сцебануў мяне металічным прутом па пальцах, што я ад болю нема закрычала. А ўкраінец за мяне заступіўся. Навошта б'еш, сказаў, яна ж не вучаная, стой і паказвай ёй, як трэба.

На заводзе беларускі працавалі каля года. Кармілі палонных двойчы на дзень. Акрамя баланды з бручкай, давалі яшчэ два кавалачкі хлеба, намазаныя мармеладам, і какаву.

Яблыкі з горыччу

Тэрыторыю, дзе жылі палонныя, ахоўвалі вартавыя з сабакамі. За агароджу, акрамя як толькі на работу, нікога не выпускалі. Але былі і спагадлівыя немцы, з якімі можна было дамовіцца. Некалькі разоў Браніслава і яе сяброўцы пашчасціла выбрацца па яблыкі ў найбліжэйшы сад.

— Аднойчы мы нарвалі тых яблык цэлыя пазухі і ўжо вярталіся ў лагер, — расказвае Браніслава Іванаўна. — Але тут пачулі роў матора і ўбачылі, як да нас набліжаецца немец. Побач была рака, і мы з сяброўкай кінуліся ў ваду. А яна халодная, справа восенню была. Немец стаяў доўга, чакаў, потым паехаў, але мы не спяшаліся вылазіць. Хутка ён зноў вярнуўся, яшчэ крыху пастаяў і паехаў на гару. Толькі калі гул матора сціх, мы вылезлі з вады і пабеглі ў лагер. Там хуценька пераапрануліся ў сухое. Немцы выдавалі нам спецадзенне з грубай тканіны і надпісам «ост», а яшчэ панчохі палатняныя і боты кірзавыя на драўлянай падэшве. Крыху сагрэліся, сяброўка не захворэла, а я злягла з высокай тэмпературай.

Дзяўчыну раніцай завезлі ў бальніцу, там за ёй прыглядала старэнькая медсястра — вельмі добрая і спагадлівая. Яна давала нейкія таблеткі, ад якіх хворая моцна пацела, і кожную гадзіну мяняла ёй адзенне..

А нямецкую жывёлу пагналі дадому

Калі Чырвоная Армія нарэшце вызваліла палонных, Браніслава яшчэ некаторы час жыла ў Германіі. Яна трапіла ў сям'ю да немца, які трымаў шмат кароў і іншай жыўнасці. Яе работа была курэй карміць, вады ім наліваць і яйкі збіраць.

— Там мяне вельмі добра кармілі, — расказвае сураз-моўніца. — Гаспадар па пяць яек даваў, а я іх складвала. Па нядзелях да мяне сяброўкі прыходзілі, я іх яйкамі і малаком частавала. Гаспадар малаком таксама дзяліўся. Ён кароў, дарэчы, сам даіў. Хаця ў яго жонка была і дачка Урзал, па нашаму Роза. Аднойчы я папрасіла, каб ён і мяне навучыў даіць. І ён не адмовіў. Потым налье літровы кубак малака: «Кіндр, трынькін». Я крыху адап'ю, а ён дальше і ў пакой прынясе да мяне.

Потым, калі нашы забіралі ў немцаў кароў і коней, я папрасіла, каб гаспадару пакінулі штосьці з жывёлы. Камандзір добры быў, таксама беларус, з Аршанскага раёна, дазволіў немцу забраць тры каровы, два кані, жарабца і цяля. Той у знак падзякі ўзяў мой адрас і нават некалькі лістоў прыслаў. Але я не разумела, што там напісана, і нічога не адказвала. Ён і перастаў пісаць.

Калі нарэшце дазволілі вярнуцца дадому, Браніслава з сяброўкамі да Польшчы ішла пешшу — дзяўчаты кароў гналі, хлопцы — коней. Па дарозе кароў даілі і пры дапамозе сепаратара рабілі масла. У Польшчы і жывёлу, і людзей пагрузілі ў таварняк і павезлі да Оршы. Адтуль Браніслава дабіралася спачатку да Шклова, а потым да роднай Дубраўкі. Аднавяскоўцы, як яе ўбачылі, кінуліся абдымацца. Хтосьці, гледзячы на дзяўчыну, плакаў, хтосьці цалаваў. Родныя яна не заўважыла і хуценька пабегла дадому.

— Калі ўбачыла сваю хату — разбітую, глінай абмазаную, сэрца зашчаміла, — змахвае слязу са шчакі суразмоўніца. — І тут маці з сястрой Антоськай з яе выскачылі, на шыю мне кінуліся, плачуць, і я таксама. Сядзелі так, абняўшыся, на ганку ўтрох і плакалі. Потым пайшлі ў хату, стол накрылі, маці дастала з печы бульбу з грыбамі. Здавалася, смачней за тую страву я нічога ў жыцці не каштавала.

Замуж так і не выйшла

Пасля прыезду Браніслава яшчэ тыдзень дома заставалася — сяляне да яе хадзілі, распытвалі, дзе і як была. А затым працаўладкавалася ў калгас «Спартак». Цэнтр гаспадаркі быў у Фашчаўцы, а ў Дубраўцы існавала брыгада. Жанчына кароў даіла і таго немца, што навучыў яе гэтай справе, добрым словам успамінала. Пасляваеннае жыццё нялёгкім было. Шмат працаваць прыходзілася. Дом з сястрой Антосяй удзвюх будавалі.

— Лесу давалі ўсяго два кубаметры, а гэта зусім мала, — уздыхае жанчына. — Гарэлкі з бульбы выганім і леснікам завязём. Яны яшчэ крыху дабавяць. Маці слабенькая была, нямоглая, памерла ў 1973-м на Новы год: сэрца падвяло. І засталіся мы з сястрой. Гаспадарку вялікую трымалі — па дзве каровы і па чацвёра свіней. Здавалі, каб капейку нейкую зарабіць. Думаеце, лёгка? Трэба было і жывёлу накарміць, і на работу паспець. Але ж жылі неяк.

— А чаму замуж не выходзілі? Кавалераў не было?

— Кавалераў было — граблямі не пераграбеш. Але ўсё не тыя. Адзін не так гаворыць, другі курыць — прынцыповая была. Вось і прыходзілася самой мужчынскую работу рабіць. І з плугам хадзіла, і з бараной, і з касой. Сястра накляпае касу і сабе, і мне — і косім.

— А святы ў вас былі?

— А як жа! Каляды, Новы год. Бліноў напячом, сала насмажым. На Раство ёлачку ставілі, цацкі з паперы рабілі.

— У вас было вельмі цяжкае жыццё, што вас суцяшала?

— Я ўвесь час чытала «Ойча наш» і цяпер чытаю. Кожны дзень Богу малюся. Вунь бачыце — на акне крыж драўляны стаіць, ён мне ад старэйшай сястры дастаўся, а ёй — ад маці. Колькі яму гадоў, ніхто не ведае. З пакалення ў пакаленне па мацярынскай лініі перадаецца. Шмат гора нацярпелася, але ж Бог ніколі мяне не пакідаў. Веру, што ён ёсць на небе, і буду верыць да канца жыцця. Трэба ж было мне столькі гадоў пражыць пасля тых пакут. Цяпер пляменніца Зіна мяне глядзіць так, як некаторыя сваіх бацькоў не глядзяць. Я памру — буду з таго свету ёй дапамагаць. Я яе не кіну.

— І сяброўкі ў яе ёсць, — удакладняе пляменніца. — Люба Пятакова і Надзея Касперская, адной — 71 год, другой — 68. Але ім падабаецца размаўляць з бабуляй. І з боку дзяржавы да нас вялікая ўвага. Вунь колькі ўзнагарод бабулі ўручылі. Мы гэты клопат ва ўсім аддзячваем. Зімой у Браніславы Іванаўны крывацёк страўніка здарыўся, у рэанімацыю трапіла, а праз дзень пасля таго, як прывезлі дадому, — запаленне. І ўрачы ўсё зрабілі, каб яе выратаваць. Нізкі паклон ім да самай зямлі.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Шклоўскі раён.

Падзея

Вучэбна-навуковая лабараторыя... у космасе

Другі касмічны нанаспадарожнік «BSUSat-2» БДУ паспяхова выведзены на арбіту. Знакавая падзея ў гісторыі вядучай беларускай ВНУ адбылася 27 чэрвеня 2023 года ў 14.34.49 (па маскоўскім часе).

«BSUSat-2» быў запушчаны ў Расіі са стартавага комплексу касмадрома «Усходні» на ракеце-носьбіце «Саюз-2.1б» з касмічным апаратам «Метэор-М» № 2-3 і 41 расійскім і замежным спадарожнікамі ў якасці спадарожнай нагрузкі. На Зямлі ўжо быў прыняты першы сігнал ад апарата, які зараз апрацоўваецца спецыялістамі.

Запуск другога ўласнага нанаспадарожніка стаў вынікам пяцігадовай работы супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ. Праца над яго стварэннем вялася з 2018 года з улікам назапашанага вопыту з «BSUSat-1», які быў выведзены на арбіту 29 кастрычніка 2018 года з касмадрома Цзюцюань.

Па тэхнічных і тэхналагічных параметрах «BSUSat-2» перасягнуў першы апарат. Ён важыць каля трох кілаграмаў і ў адрозненне ад свайго папярэдніка большы па памерах — 30х10х10 см. Усе асноўныя кампаненты і сістэмы зроблены ў Беларусі.

Другі спадарожнік уяўляе сабою ўніверсальную лётную платформу модульнага тыпу з аб'яднальнай мацярынскай платформай, каркасам, службовымі модулямі асноўных бартавых падсістэм для энергазабеспячэння, радыёсувязі, кіравання, арыентацыі і стабілізацыі і наборам модуляў карыснай нагрузкі пад пэўныя навуковыя і практычныя задачы. Апарат таксама абсталяваны ўнікальнымі сонечнымі батарэямі, устойлівымі да касмічнай радыяцыі. Акрамя таго, у адрозненне ад першага спадарожніка ў «BSUSat-2» сістэма кіравання цалкам мадэрнізаваная, установлены дзве новыя камеры высокай дакладнасці і дадатковыя каналы сувязі.

З запускам другога апарата на арбіце сфарміравалася свайго роду лятальная вучэбна-навуковая лабараторыя, якая будзе забяспечваць развіццё новых напрамкаў у навучанні і навуцы па аэракасмічным кірунку. Гэта дасць магчымасць выканаць шырокі спектр задач з больш якаснымі паказчыкамі. У навуковых і адукацыйных мэтах будзе праводзіцца вывучэнне і даследаванне радыяцыйных палёў калязямной прасторы, радыяцыйнай стойкасці электронных элементаў, дыстанцыйнае зандзіраванне Зямлі. Дарэчы, у БДУ вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па аэракасмічным, радыёэлектронным і космааэракартаграфічным профілях на факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, факультэтах геаграфіі і геаінфарматыкі і фізічным факультэце.

Абодва ўніверсітэцкія спадарожнікі будуць пралятаць над тэрыторыяй Беларусі шэсць разоў у суткі, знаходзячыся ў зоне радыёбачнасці 10-11 хвілін. За гэтыя кароткія інтэрвалы можна прыняць інфармацыю тэлеметрыі і мэтавай нагрузкі.

Перадача інфармацыі ідзе ў радыёаматарскім дыяпазоне. Таму, валодаючы мінімальнымі сродкамі прыёму, атрымаць даныя са спадарожніка могуць таксама арганізацыі і прыватныя асобы. Для акумулявання сабраных звестак распрацаваны інтэрнэт-партал. Для прыёму даных выкарыстоўваецца размеркаваная сетка з некалькіх прыёмных станцый. Акрамя таго, маецца таксама ўласная аўтаматычная наземная станцыя прыёму, уключаная ў сусветную сетку радыёаматарскіх прыёмных станцый SatNODS. Рэсурсамі, атрыманымі ўсімі сродкамі прыёму, можа скарыстацца ўся сусветная навуковая супольнасць, якая займаецца распрацоўкай службовай платформы, мэтавай нагрузкай звышмалых касмічных апаратаў, фундаментальнай касмафізікай, астрафізікай, вывучэннем радыяцыйных паясоў Зямлі, верхніх пластоў атмасферы і г. д.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сядзі і глядзі

Казкі ў сямейным коле

Канікулы — выдатная магчымасць знаходзіць час для любімых заняткаў. Напрыклад, пераглядзець добрыя анімацыйныя фільмы, да таго ж у кампаніі бацькоў. У найбліжэйшыя выхадныя на тэлеканале «Беларусь 3» пакажуць «Казку пра зорнага хлопчыка», а на «Беларусь 2» — анімацыйную стужку «Карлік Нос».

Абодва фільмы сёлета адзначаюць круглыя даты з моманту выхаду. Так, дзіцячая музычная казка вытворчасці «Беларусьфільма» ўбачыла свет у 1983 годзе. Зняў яе рэжысёр Леанід Нячаеў як экранізацыю па матывах «Хлопчыка-зоркі» і іншых казак Оскара Уайльда. Гэта гісторыя пераўтварэння казачнага персанажа пад уплывам любові. І ўвасобілі яе на экране шматлікія таленавітыя акцёры, дзе і Ларыса Панамарэнка, Павел Чарнышоў, Расціслаў Янкоўскі і іншыя. Чакайце сеанс у эфіры сацыякультурнага тэлеканала раніцай у суботу, 1 ліпеня.

У нядзелю, 2 ліпеня, днём на тэлеканале «Беларусь 2» — анімацыйны фільм «Карлік Нос», зняў яго рэжысёр Ілья Максімаў у 2003 годзе. І гэта ўжо чароўны і захапляльны аповед пра вечную сілу любові і сяброўства, створаны па матывах класічных казак Вільгельма Гаўфа. Тут добро змагаецца са злом, герояў чакаюць выпрабаванні, а пасля шчаслівы фінал, аднак ці ўсе дойдуць да яго?..

Ролі агучвалі Альберт Асадулін, Алена Шульман, Наталля Данілава, Віктар Сухарукаў і іншыя. Анімацыйны фільм здабыў шмат узнагарод, сярод якіх, напрыклад, Гран-пры на Міжнародным фестывалі фільмаў для дзяцей у Санкт-Пецярбургу (2003 г.), вышэйшая ўзнагарода на Міжнародным фестывалі анімацыйнага кіно «Анімаеўка» ў Магілёве (Беларусь, 2003 г.) і прыз сімпатый гледачоў на фестывалі дзіцячых фільмаў у Гамбургу (Германія, 2003 г.). Паглядзіце самі, каб ацаніць майстэрства кінамайстроў.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 175

Сваю задачу прапануўвае Вячаслаў Красічонак з Бабруйска *(гл. дыяграму)*.

Белыя: Крh7, Ферб6, Ле8, Лg4, Сb1, Сf2, Кс7, Кh4, пс4 (9).

Чорныя: Крe4, Фс2, Лb2, Лd3, Сс6, Сg7, пп. с3, d7, e5, f4 (10).

Мат за 2 хады.

Блізня: пешка d7 на b7.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У мінулым выпуску мы распавялі пра выступленне беларускіх шахматыстаў на чэмпіянатах свету па хуткіх шахматах сярод юнакоў і дзяўчат у Батумі. Там жа нашы суайчыннікі заваявалі некалькі медалёў у бліцы: залаты — Насця Севасцянчук (да 10 гадоў), сярэбраныя — Арцём Стрыбук і Ксенія Норман (да 16), Ксенія Зелянцова (да 18). У рашэнні задач другое месца заняў Арцём Сіняўскі, трэція — Арцём Стрыбук і Юлія Лявонава. З улікам хуткіх шахмат беларусы прывезлі з Грузіі 11 медалёў.

* * *

На рэспубліканскай спартакіядзе школьнікаў першыя тры месцы занялі адпаведна Мангілёўская, Брэсцкая вобласці і Мінск.

На шахматным фестывалі ў Гродне ў галоўным турніры па хуткіх шахматах (26 удзельнікаў) прызавую тройку склалі Андрэй Альховік, Раман Канюшэўскі і Яўген Чупрыненка, па бліцы (28 гульцоў) — гросмайстар Кірыл Ступак, Раман Канюшэўскі і Ксенія Норман.

* * *

У Расіі прайшлі спаборніцтвы «Белая ладдзя» з удзелам 87 камандз. Мінскія гімназісты, якія прадстаўлялі Беларусь, фінішавалі чатырнаццатыя (пяць перамог, два пройгрышы, дзве нічыі).

У Маскве на Кубку МДУ (з удзелам камандз ВНУ з дзевяці краін) зборная Беларускага ўніверсітэта фізічнай культуры заняла шостае месца.

На турніры ў Нагпуры (Індыя; 134 удзельнікі) Аляксей Аляксандраў фінішаваў на 4-м месцы, Аляксей Фёдараў — на 17-м, Віталь Цецераў — на 35-м. У індыйскім Бхубанесвары (296 гульцоў) А. Фёдараў і А. Аляксандраў падзялілі першае-пятае месцы (па дадатковых паказчыках у іх адпаведна другое і пятае), В. Цецераў быў трынаццаты.

Андрэй Кавалёў фінішаваў чацвёрты ў Будапешце.

У турнірах па бліцы на сайце chess.com Дзяніс Лазавік заняў 13-е месца з 404 і 8-е з 538.

* * *

Наступныя дзве партыі — з сёлетніх чэмпіянатаў Беларусі да 20 гадоў.

Максім Царук — Арцём Стрыбук. 1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. d4 cd 4. K:d4 Kf6 5. Kc3 Kc6 6. Cg5 e6 7. Фd2 a6 8. 0-0-0 Cd7 9. f3 Лc8 10. Крb1 Ce7 11. K:c6 C:c6 12. h4 h6 13. Ce3 b5 14. Cd3 h5 15. Cg5 Фc7 16. Лhe1 0-0 17. Ke2 Лfd8 18. Kf4 d5 19. C:f6 C:f6 20. e5 C:e5 21. K:h5 Ce8 22. f4 Cd6 23. g4 g6 24. f5 Cf8 25. fg fg 26. Kf6+ Kph8 27. K:e8 Л:e8 28. C:g6 Ле7 29. Фg5 b4 30. Ле5 Фc4 31. Фf6+, 1:0.

Аляксандра Тарасенка — Лізавета Ляшкевіч. 1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. d4 ed 4. K:d4 Kf6 5. K:c6 bc 6. e5 Фe7 7. Фe2 Kd5 8. c4 Ca6 9. b3 g6 10. Cb2 Cg7 11. Kd2 0-0 12. 0-0-0 Лae8 13. Kf3 f6 14. Фd2 Kb6 15. Фa5 Cb7 16. Ca3 Фf7 17. C:f8 Ф:f8 18. c5 Kd5 19. Cc4 fe 20. Ф:c7 e4 21. Ф:b7 Ф:c5 22. Л:d5 Фa3+ 23. Крd1 cd 24. Ф:d5+ Kph8 25. Kg5 h6 26. Kf7+ Kph7 27. Фd2 d5 28. C:d5 Фc5 29. Крe2 e3 30. fe C:c3 31. Лc1 Фb5+ 32. Фd3, 1:0.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Cg1! Не вядзе да мэты 1. Ф:b3+? Крc5! або 1. Фb4? K:d2! Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цялпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Кінаімёны

ПОСПЕХ ГАЛОЎНАЙ ГЕРАІНІ

У нядзелю, 2 ліпеня, спаўняецца 95 гадоў з дня нараджэння народнай артысткі Расіі, савецкай актрысы Таццяны Пілецкай. Яна вядомая па фільмах «Маці» (1955 г.), «Нявеста» (1956 г.), «Двое ў новым доме» (1978 г.), «Раман імператара» (1993 г.) і г. д. Азірнуцца на жыццёвы і творчы шлях Таццяны Львоўны ў нас будзе магчымасць напярэдадні яе юбілею. Расказваем, якія дакументальныя і мастацкія кінастужкі з гэтай нагоды пакажуць у тэлеэфіры.

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Труба круглая 426х22, 7 м	470,40	47,04	23,52
2	МФУ CANON IR 2520 инсталлир. с двусторонним податчиком оригиналов AB1 3796B003, инв. № 202	504,00	50,40	25,20
3	Компрессор винтовой CSD 85T8,5 бар 400/50EU, инв. № 187	14070,00	1407,00	703,50
4	Станок токарно-винторезный РТ-21002, инв. № 200	2100,00	210,00	105,00
5	Ножницы комб., инв. № 50	972,00	97,20	48,60
6	Персональный компьютер, инв. № 157	7,02	0,70	0,35
7	Мотопомпа бензиновая высоконапорная SERM50VBAA, инв. № 143	394,20	39,42	19,71
8	Мотопомпа бензиновая высоконапорная SERM50VBAA, инв. № 206	394,20	39,42	19,71
9	Автомобиль ГАЗ-32213-408 сл. кузов, инв. № VIL00208	1674,00	167,40	83,70
10	Инструменталка, инв. № 109	459,00	45,90	22,95
11	Трансформатор ТДМ-403, инв. № 93	45,90	4,59	2,30
12	Автомобиль ГАЗ-32213-414, инв. № 62	540,00	54,00	27,00
13	Инструменталка, инв. № 116	459,00	45,90	22,95
14	Бензопила Штиль MS 250 (без цепи и шины), инв. № 186	162,00	16,20	8,10
15	Инструменталка, инв. № 126	459,00	45,90	22,95
16	Полуавтомат для сварки инверторный MIG500A/MMA, инв. № 203	810,00	81,00	40,50
17	Холодильник МХМ-2808-90. сер-т BY/112 03/06/002, инв. № 139	118,80	11,88	5,94
18	Сварочный бензиновый генератор WAGT 220DC HCB, инв. № 130	237,60	23,76	11,88
19	Трансформатор свар. ТДМ252 (380В, плав. регул. 50-250А), инв. № 121	86,40	8,64	4,32
20	Станок гор-фрез 6М82Г, инв. № 230	1566,00	156,60	78,30
21	Станок ток-винт 1В62Г, инв. № 231	2322,00	232,20	116,10
22	Станок верт-сверл 2Н135, инв. № 233	1782,00	178,20	89,10
23	Выпрямитель ВДГ-303, инв. № 81	97,20	9,72	4,86
24	Станок попер.-стр. 7Б35, инв. № 236	1242,00	124,20	62,10
25	Сканер CANON 400 2996C010, инв. № 218	162,00	16,20	8,10
26	Ножницы НБ-318, инв. № 243	1566,00	156,60	78,30
27	Агрегат сварочный (САК), инв. № 103	810,00	81,00	40,50
28	Монитор ЖКИ, инв. № 70	16,20	1,62	0,81
29	Сварочный полуавтомат ПДГ-354, инв. № 115	378,00	37,80	18,90
30	Окрасочный агрегат 650 на колесиках со шлангом 3/8, поводок 1/4 и держателем XHD, инв. № 216	648,00	64,80	32,40
31	Многофункциональное устройство CANON MF-4450, инв. № 152	81,00	8,10	4,05
32	Монитор LCD Philips, инв. № 100	16,20	1,62	0,81
33	Принтер Phaser 3150, инв. № 79	35,64	3,56	1,78
34	Сварочный генератор WAGT 220DC HSB, инв. № 140	318,60	31,86	15,93
35	Персональный компьютер, инв. № 165	7,02	0,70	0,35
36	WK330EA ноутбук HP Probook 4520s i333M 15 4GB/500, инв. № 149	86,40	8,64	4,32
37	Компьютер без монитора, инв. № 88	7,02	0,70	0,35
38	Монитор ЖК, инв. № 89	16,20	1,62	0,81
39	Под. мех. ПДГ-312, инв. № 43	91,80	9,18	4,59
40	Выпрямитель ВДГ303-3, инв. № 44	97,20	9,72	4,86
41	Кунг К-375 № 01115, инв. № 128	475,20	47,52	23,76
42	Сварочный трансформатор ТДМ-405 (380В, AI) № BY/112 03, инв. № 136	28,62	2,86	1,43
43	Монитор LCD Philips, инв. № 99	16,20	1,62	0,81
44	Теодолит 3Т2КП, инв. № 94	831,60	83,16	41,58
45	Агрегат сварочный АДД-4004 МУ1, инв. № 78	2376,00	237,60	118,80
46	Абраз. уст., инв. № 56	399,60	39,96	19,98
47	Контейнер М-К2-2-13, инв. № 83	59,40	5,94	2,97
48	Влагомаслоотд ВМО 60, инв. № 57	626,40	62,64	31,32
49	Выпрямитель, инв. № 6	594,00	59,40	29,70
50	Виброплита, инв. № 60	410,40	41,04	20,52
51	Контейнер металлический М-К2-2-13, инв. № 110	89,64	8,96	4,48
52	Контейнер М-К2-2-15, инв. № 84	89,64	8,96	4,48
53	Водоотливная уст-ка, инв. № 15	6588,00	658,80	329,40
54	Плоттер HP Desjqnjet 111 Roll, инв. № 137	248,40	24,84	12,42
55	Контейнер М-К2-2-13, инв. № 91	78,84	7,88	3,94
56	Агрегат отопительный АО-ЭВ02-15кВт, инв. № 119	302,40	30,24	15,12
57	МАЗ 256170 автобус, инв. № 198	15984,00	1598,40	799,20
58	Персональный компьютер, инв. № 160	101,52	10,15	5,08
59	П/прицеп-1212, инв. № 63	3456,00	345,60	172,80
60	Телевизор «Горизонт» с подставкой, инв. № 141	95,04	9,50	4,75
61	Трансформатор ТДМ-403, инв. № 95	88,56	8,86	4,43
62	П/автомат свар., инв. № 20	2160,00	216,00	108,00
63	Автомобиль «Тайота Королла», инв. № 176	14148,00	1414,80	707,40
64	Диван-кровать двухместный Клад-15.6 с двумя креслами, инв. № 142	129,60	12,96	6,48
65	Контейнер металлический М-К2-2-13, инв. № 117	89,64	8,96	4,48
66	Диз. агрегат для откачивания грунт вод, инв. № 66	3024,00	302,40	151,20
67	ПЭВМ, инв. № 54	11,88	1,19	0,59
68	Принтер, инв. № 55	129,60	12,96	6,48
69	Трансформатор свар. ТДМ-403, инв. № 77	59,40	5,94	2,97
70	Трансформатор, инв. № 10	302,40	30,24	15,12
71	Падающий мех. ПДГ-312, инв. № 80	87,48	8,75	4,37
72	Аппарат факс. «Панасоник», инв. № 59	15,12	1,51	0,76
73	Пылесос промышленный AS 600 inox, инв. № 182	442,80	44,28	22,14
74	Виброплита YS-244, инв. № 132	259,20	25,92	12,96
75	Кран мост. электр. однобал. опорный 2 т, 11.5 м, инв. № 86	4320,00	432,00	216,00
76	Опалубка (соед. болт 456 шт. х 14099 и панель 100 х 125 – 12 шт., инв. № 131	756,00	75,60	37,80
77	Принтер, инв. № 72	129,60	12,96	6,48
78	Кран-балка 3т, 12 м, инв. № 257	4536,00	453,60	226,80
79	Выпрямитель ВДУ-506С УЗ (380В0 с падающим мех. ПДГО-510 УЗ.1), инв. № 154	2160,00	216,00	108,00
80	П/прицеп METAKO 2309, инв. № 90	7884,00	788,40	394,20
81	1-ый комплект насосов, инв. № 112	3024,00	302,40	151,20
82	2-ой комплект насосов, инв. № 113	1836,00	183,60	91,80
83	Компьютер в сборе DELTA и сист. блок intel Pentium G5500 монитор LG, инв. № 209	90,72	9,07	4,54
84	3-ий комплект насосов, инв. № 114	3024,00	302,40	151,20
85	Многофункциональное устройство CANON MF-4450, инв. № 153	291,60	29,16	14,58
86	П/прицеп МАЗ 93802, инв. № 35	2592,00	259,20	129,60
87	Л/автомат свар., инв. № 37	442,80	44,28	22,14
88	ПЭВМ Pentium DCE 2200, инв. № 102	11,88	1,19	0,59
89	Установка 12561, инв. № 39	3240,00	324,00	162,00
90	WK330EA Ноутбук HP Probook 4520s i333M 15 4GB/500, инв. № 151	172,80	17,28	8,64
91	Агрегат отопительный АО-ЭВО.2-15кВт, инв. № 120	302,40	30,24	15,12
92	WD848EA ноутбук HPProBook4520si333M 15,6QB/320QB, инв. № 147	172,80	17,28	8,64
93	Монитор LCD 190S8FB\00, инв. № 105	32,40	3,24	1,62
94	WD848EA ноутбук HP ProBook4520si333M 15,6QB/320QB, инв. № 148	172,80	17,28	8,64
95	Принтер Canon LBR3000, инв. № 106	129,60	12,96	6,48
96	Картина, инв. № 332	10,80	1,08	0,54
97	Трансформатор сварочный ТДМ-504-1 У2, инв. № 134	842,40	84,24	42,12
98	Персональный компьютер MYG-I5-760-P55A, инв. № 156	101,52	10,15	5,08
99	Персональный компьютер MYG-I5-760-P55A, инв. № 155	90,72	9,07	4,54
100	Холодильник, инв. № 49	48,60	4,86	2,43

В отношении лотов №№ 1–4 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 65 %.** Ранее публикация о торгах размещалась в газете «Звязда» № 252 (29874) от 23.12.2022, стр. 14, № 21 (29901) от 02.02.2023, стр. 10, № 55 (29935) от 23.03.2023, стр. 15, № 75 (29955) от 20.04.2023, стр. 10, № 91 (29971) от 16.05.2023, стр. 10, № 107 (29987) от 07.06.2023, стр. 14.

В отношении лотов №№ 5–43 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 55 %.** Ранее публикация о торгах размещалась в газете «Звязда» № 21 (29901) от 02.02.2023, стр. 10, № 55 (29935) от 23.03.2023, стр. 15, № 75 (29955) от 20.04.2023, стр. 10, № 91 (29971) от 16.05.2023, стр. 10, № 107 (29987) от 07.06.2023, стр. 14.

В отношении лотов №№ 44–100 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация о торгах размещалась в газете «Звязда» № 91 (29971) от 16.05.2023, стр. 10

Местонахождение лотов: 222410, Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. 1 Мая, д. 976

Дата и время проведения торгов	**12 июля 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**с 10.00 30 июня 2023 года до 16.00 10 июля 2023 года**

Условия для участия в торгах:

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, Задаток для участия в торгах по Лоту __, Унитарное предприятие «Вилейское СМУ ОАО «Минскводстрой», проводимых 12.07.2023.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте: https://orgtorg.by/info.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **– Чеслав, +375299999112.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности

Информация о продавце	**Унитарное предприятие «Вилейское СМУ ОАО «Минскводстрой», в лице ликвидатора – ООО «Центр антикризисных проектов», тел.: 80172552928; +375293489225 (222410, Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. 1 Мая, д. 976)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

Информация о проведении аукциона (далее – Аукцион) по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов в **д. Заброденье, д. Осово, д. Жажелка, д. Белая Лужа** Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области.

Аукцион состоится **28 июля 2023 г. в 15.00** в Жодинском сельском исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3, кабинет № 1.

Организатор аукциона: Жодинский сельский исполнительный комитет

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	**д. Заброденье**	624881706101000103	0,15 га	(1 09 02) земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, права на него и сделок с ним, квартиры в блокированном жилом доме)	6 000,00
2	**д. Осово, ул. Горького**	624881710301000046	0,1496 га		7 000,00
3	**д. Жажелка, ул. Заречная**	624881705601000184	0,15 га		9 000,00
4	**д. Белая Лужа**	624881701601000142	0,15 га		7 000,00

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by,** Смолевичского райисполкома: **http://www.smolevichi.gov.by.**

УНП 600023532

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

Комитетом государственного имущества

Гродненского областного исполнительного комитета

проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

1) Здание нежилое, инженерные сети, объекты благоустройства, по ул. Матросова, 3, в г. п. Россь Волковысского района.

Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

2) Здание казармы под склад с террасой, инженерные сети, объекты благоустройства, по ул. Красноармейской, 47 в г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.

Начальная цена предмета аукциона – 6 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.
Аукцион состоится – **21.07.2023 г. в 11.30.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **17.07.2023 г. до 16.00**.

1) Здание бани, наружные водопроводные и канализационные сети, в Волковысском районе, Росского с/с, г. п. Россь, ул. Красноармейская, 44.

Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

2) Комплекс объектов бывшего в/г № 11 в Волковысском районе, Росский с/с, 31, 31/1-31/13, около д. Лозы.

Начальная цена предмета аукциона – 18 базовых величин (недвиж. 17 баз. в. + кабель 1 баз. в.).
Размер задатка – 1 базовая величина.
Аукцион состоится – **21.07.2023 г. в 12.00.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **17.07.2023 г. до 16.00.**

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске: **8 (01512) 5 13 44, 2 06 03.**
в городе Гродно: **8 (0152) 62 39 24, 62 39 32, 62 39 23.**
Дополнительная информация размещена на сайте: **https://au.nca.by**

УНП 500042135

Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by
Продавец	ОАО «Строймаш», г. Минск, ул. Рыбалко, д. 26, 220033
В извещение о проведении открытого аукциона (10.07.2023 г.) по продаже имущества ОАО «Строймаш» (опубликовано в газете «Звязда» от 09.06.2023 г.) вносится изменение: «Задаток 5 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа перечисляется на расчетный счет ОАО «Строймаш»: BY89 BPSB 3012 1077 7001 5933 0000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 100104712	
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

УНП 191226636

Настоящим ООО «Реалконсалтинг» СООБЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ

УНП 191302068

в извещение (опубликовано в газете «Звязда» 16.06.2023) о проведении открытого аукциона № 16/23 по продаже капитальных строений и движимого имущества, принадлежащих ООО «ЕВРОЛАЙТ».

Извещение дополняется абзацем следующего содержания:

Победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов) уплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,4 процента от конечной цены продажи предмета аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона путем перечисления на расчетный счет Организатора аукциона.

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОДО «ФАРМИН»** (УНП 190073936), объявляет о проведении **03.08.2023 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

Утерянные квитанции 1-СУ ЗАСО «Белнефтестрах» серии ВА № 3971785, 4689087, 4806776 и бланки строгой отчетности по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу серии НВБ № 865937, 935029, 935030, серии НВЗ № 001259, 097128 **считать недействительными.**

АБО ВЯСЁЛЫЯ І ПРАЎДЗІВЫЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»
АЛЁ, НАРОД НА ПРОВАДЗЕ!

НЕ ТКНІ НОСА Ў ЧУЖОЕ ПРОСА!

У тую суботу надвячоркам дзве сяброўкі-старшакласніцы Лена з Аняй прыйшлі да трэцяй, да Тані, і чым займаліся перад паходам у кіно, доўга распісваць не трэба: розныя строі мералі, адна адной прычоскі рабілі ды вочкі падмалёўвалі, пра хлопцаў размаўлялі. Чацвёртая з сябровак, Марына, самая баявая ды вясёлая, трохі пазнілася: як на крылах, ляцела ў двор, але ж пры гэтым згледзела, што ў Тані пад адчыненым акном (хата на высокім падмурку) хтосьці сядзіць у кусце парэчак.

«Тармазнула» крыху, прыгледзелася: па красоўках пазнала Толічка. «Дык вось хто раззваніў, што Анюце Сашка падабаецца, — здагадалася дзяўчына. — Падслухоўваеш, значыць... Ну, тады трымайся!»

Марына зайшла ў хату, пашапталася з Ленай, і ўдзвюх яны хутка прыдумалі «план».

— Тань, ну колькі тут гэтаму букету стаяць? — спытала Марына, падышоўшы да акна. — Яго ж трэба выкінуць.

Гаспадыня рот адкрыць не паспела, як падвялыя кветкі — разам з вадою — плюх за акно.

Нацякло хлапцу за каўнер... А нідзе ж не дзенешся — трэба сядзець...

Як раптам і Ленка ў лямант:

— Ой, а хто гэта Барсіка ў хату ўпусціў? У мяне ж на поўсць алергія — зараз чхаць пачну!

А пакуль тое — схапіла з канапы соннага ката і праз акно...

Барсік не паспеў, відаць, згрупавацца, і таму, уляцеўшы ў куст ды ўпаўшы на нешта цёплае (Толіку на галаву), моцна ўчапіўся ў яе кіпцюрамі — каб далей не ляцець.

Марына ж тым часам да акна падсела — гаворыць, смяецца: «разведчыку» не выпадае ўцякаць — заўважыць...

І Таня без справы не сядзіць: у літровым слоіку сінюю акварэльную фарбу вадой разводзіць, каб потым са словамі: «От гэты малы — маляваць малюе, а за сабой ніколі не прыбярэ»...

Ну, вы зразумелі... Частка фарбы расцяклася па лістах парэчкі, але ж і Толіку яе хапіла!

Факт, што сядзіць ён, бедны — мокры, абдзёрты, у сініх разводах — план адступлення прадумвае. У дзяўчат жа — самы азарт.

— Трэба яго мукой прысыпаць, — шэпча Анюта, у якой на Толіка самая большая крыўда.

— А мы ўчора кісель недапілі, зараз прынясу, — успомніла Таня.

Такім чынам «фінальны акорд»: за акно на Толіка ліецца кісель, сыплецца мука. І ён, зразумеўшы, што рассакрэчаны, як той лось, крышачы кусты парэчак ды агрэсту, топчучы градкі цыбулі ды бульбы, пераскоквае плот і...

Собіла ж: «прызямляецца»... перад самым носам у цёткі Марусі!

Тая з перапуду (ну яшчэ б — штосьці белае, кудлатае, у сініх падцёках і крыві!) — забылася, куды ішла.

...У клубе ў той вечар Толічка не было. Цётка Маня «ў грыме» яго не прызнала і яшчэ доўга ў вёсцы расказвала, якога ж злодзея ці бандыта бачыла, «варажыла», хто яго збіў («на горкі яблык!») і куды ён мог уцякаць.

А сяброўкі трымаліся як нічога ніякага... Хіба Марына пры сустрэчы з Толікам не вытрымлівала і пырскала смехам. «Разведчык» пры гэтым густа чырванеў.

Алена Несцяронак,
г. Докшыцы.

ІСКРУ ТУШЫ ДА ПАЖАРУ...

Лета ў разгары — дачнікі ў запарцы: народу ў аўтобусе — яблык не ўпадзе! Усе з сумкамі, з торбамі, з сабачкамі (радзей з катамі)... Цесна! Што, вядома ж, дрэнна. Што добра — стоячы, ці седзячы, так блізка адзін ад аднаго, можна столькі пачуць!..

— Работы дома — хоць заваліся, а мой Іван тым ранкам сеў у «Жыгулі» і з'ехаў у горад, — расказвала адна вяскоўка другой. — Прыйшлося самой запрагацца: ніхто мне, думаю, не паможа, але і не перашкодзіць... Ці паверыш: не прысела за дзень! Столькі ўсяго зрабіла, што вечарам ледзь абмылася, ледзь да ложка дапаўзла! У хаце горача — для прыліку прасцінку накінула... А засынаючы, успомніла, што дзверы не зашчапіла... Але ж каб устаць — ну ніякіх сіл не было! Супакоілася тым, што суседзі без званка цяпер не прыходзяць, зладзеяў не чуваць — ды і мужу адчыняць не трэ будзе... Галаву да падушкі — і ў сон.

Але ж сплю і «бачу», што сяджу нібыта ў такім во аўтобусе... Толькі побач нейкі смурод. І ногі ў мяне падкурчаны... Хачу выцягнуць, выпрастаць — месца няма.

Прачынаюся — як быццам ногі па-ранейшаму ўпіраюцца, і перагарам смярдзіць... Сэрца зайшлося: нехта чужы (а ўжо ж вялізны!) у мяне на ложку сядзіць. Не ведаю, як не самлела! Прысела, нацягнула прасціну.

— Во, такі прачнулася! — далятае да вушэй. — А то ўсё буджу-буджу, — ніякай рэакцыі.

— Хто вы? — пытаюся. — Што вам трэба?

— ...І загаварыла, — узрадаваўся «госць», — а я ўжо думаў, што глуханямая... Матацыкл мой стаў блізу вашых варот — бензін скончыўся. Дык скажыце, у каго можна ўзяць — купіць ці пазычыць? Мне б дадому даехаць... На работу заўтра...

На шчасце, у пакоі крыху сцямнела: месяц за хмарку зайшоў. Я з ложка — кулём, халат сабе на плечы, мабільнік схапіла і да дзвярэй.

Вывела незнаёмца на вуліцу, паказала мехдвор: ідзі, маўляў, на агні. І як найхутчэй...

Недалёка той адышоўся ў адзін бок, як з другога — шум «Жыгулька»: Іван мой прыехаў... Каб, крый божа, раней... Мусіць, нічога яму не даказала б: на развод падаў бы... А ў чым я перад ім вінаватая?..

— У тым, што працаваць меней трэба, — адказала слухачка расказчыцы. — І дзверы зачыняць. А то ж гэтым разам нехта падсеў, а наступным, крый бог, падляжа, і ты не пачуеш.

...Цікавая выснова. Да яе, на мой погляд, варта прыслухацца. Бо людзі ж праўду кажуць: іскру тушы да пажару, бяду адводзь да ўдару.

Наталля Шастакова,
г. Гомель.

ЧАМУ БАГАТЫЯ ПЛАЧУЦЬ

На ўсімі любімым «провадзе» ўжо былі, відаць, гісторыі аб тым, колькі смеху могуць нарабіць граматычныя памылкі — нават у адной літарцы. Я ж хачу расказаць пра лічбачку. І пачну здалёк.

Наша сваячка Сонечка змалку здзіўляла сваёй... дарослацю. Яе садзілі есці — і яна ела, ёй казалі: «Ідзём на вуліцу», — несла ў вітальню сваё адзенне і выцягвала з паліцы патрэбны абутак, казалі, што трэба спаць, — тупала да ложачка, залазіла пад коўдру і заплюшчвала вочкі...

Не дзіця, карацей, а мара, яшчэ і таму, што за ёй, ужо трохі падрослай, не трэ было збіраць цацкі, што яна — гадоў з трох-чатырох — на пацеху ўсім старанна падмятала падлогу і парывалася вымыць посуд, што не капрызіла, як іншыя дзеці: не тупала нагамі з просьбай нешта купіць, без нічога ніякага заставалася ў бабуль і суседзяў, калі бацькам трэ было недзе адхінуцца, без праблем пайшла ў садок, а потым у школу ды інстытут.

Іншымі словамі, усё ў Соніным жыцці ішло па плане: у 22 гады яна разлічвала атрымаць вышэйшую адукацыю, прафесію і добрую работу, паглядзець трохі свет, калі пашчасціць, — стварыць сям'ю, бліжэй да трыццаці — купіць асобную кватэру. Трохі грошай на гэта падкінулі бабулі. Ды і сама яна старалася зарабляць, лішняга нідзе не траціць.

І таму праз гады ўжо глядзела, што дзе будуецца ды прадаецца. На кватэру ў новым доме яшчэ не замахвалася, але і так званыя хрушчоўкі ўжо не разглядала: шукала найлепшы варыянт сярод сярэдніх, а знайшла...

Вачам не паверыла: на так званым другасным рынку прадавалася (і ёй па кішэні!.. Хіба трохі пазычыць альбо збіць цану...) прасторная кватэра-студыя ў амаль што новым доме і прэстыжным раёне, прычым гатовая да пражывання! Гэта значыць, з усёй патрэбнай тэхнікай, з мэбляй...

Соня, карацей, тут жа пазваніла, дамовілася аб сустрэчы — паехала глядзець. І ўжо на месцы, ледзь пераступіўшы парог і сказаўшы: «Мне падабаецца. Я купляю!», маўчком, ледзь жывая ад радасці, асцярожна хадзіла па паркеце і прыгажэннай плітцы, здзіўлялася, з якім жа розумам усё ўладкавана, любавалася, як зроблена, з якіх матэрыялаў...

— Дызайнерскі праект, — ходзячы следам, расказвала рыэлтар, называючы, трэба разумець, вядомыя прозвішчы. — Плітка з Італіі — у ванным пакоі 12 адценняў колеру... Вось гэтыя шпалеры з Германіі... Тут такога не купіш...

Карацей, пасля кожнай рэчы на падлозе, столі і сценах, на вокнах і дзвярах «праважатая» сыпала больш чым гучнымі брэндамі, цэнамі на адно, другое, пятае, дваццатае...

Пакупніца, якая мела звычку шмат што складаць (асабліва «капейку» да «капейкі») міжволі падсумоўвала ды насцярожана пытала, ці не «закапаны тут нейкі сабака»? Чаму кватэра прадаецца так танна?

— Што вы, што вы... Ніякіх «сабак», — запэўніла рыэлтар.

І ў сваю чаргу з яўным недаверам пазірала на пакупніцу, думала, якой падманлівай бывае знешнасць: ну зусім жа дзяўчо — маладое, худое, у парваных, але зусім не брэндавых джынсах, без ніякага сілікону, без нарошчаных пазногцяў... Да таго ж прыехала (сустракаліся каля пад'езда) зусім не на джыпе... А бач ты — можа сабе дазволіць, купляе такую кватэру... Мусіць, спонсара нейкага мае?.. Ці ўсё ж мы памыліліся, праляцелі з цаной — мала запрасілі?

— Так-так! — «прачытаўшы» думкі, згадзілася пакупніца. — Пяцьдзясят тысяч за шчасце жыць у такой кватэры — ну яўна мала!

— Як пяцьдзясят? — залыпала вачыма рыэлтар. — Мы выстаўлялі за сто пяцьдзясят...

Як аказалася, куфрык проста адчыняўся: у аб'яве, «клопатам» нейкага разявакі, «згубілася» першая лічба.

Аднак Соня з-за яе не дужа засмуцілася. «Калі б не памылка, — разважала потым, — я, мусіць, ніколі не ўбачыла б такой прыгожай кватэры, не пабыла б крутой ды багатай (ну хоць бы ў вачах рыэлтаркі)... Не зразумела б, і чаму багатыя часта плачуць. Разам жа тусуюцца, ходзяць адзін да аднаго, зайздросцяць. А жаба, як вядома, «звер» балотны, а значыць, тутэйшы.

М. Смагіна,
г. Мінск.

Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

ПАЧАК СОЛІ І ЛІСЦЕ КАШТАНАЎ

З чаго пачынаюцца сучасныя рэвалюцыі

КАЛЯ аўтакрамы кабеты ледзьве не пабіліся... за пачак солі. Не таму, што соль нейкая адмысловая, а таму, што пачак у наяўнасці адзін. Сцэна была, трэба сказаць, яшчэ тая. Жанкі сварыліся і ледзь не рвалі адна на адной валасы, а прадаўшчыца, узвышаючыся над імі ў акенцы крамы на калёсах і будучы недасягальнай, трымала запаветны пачак солі, маючы намер аддаць яго пераможцы. Нарэшце абвясцілі нічыю — купілі тую соль напалам... Следам у чарзе стаялі дзеці. Траім гарадскім унукам, што прыехалі на канікулы, бабуля дала грошай на марожанае. Малыя з радасным нецярпеннем па чарзе камечылі ў руках тую дзясятку. Чаканні не апраўдаліся: марожанае, дый тое падталае-пакрыўленае, таксама засталося толькі адно... Дзяцюк на веласіпедзе спытаўся пра квас — квасу таксама не аказалася. «Піва купі ці чарніла. Яно заўсёды ёсць», — здзекліва параілі яму з чаргі. Бабуля хацела купіць батон, але, узяўшы ў рукі, вярнула яго назад: «Што ты, дзіцятка, ім жа цвікі забіваць»...

Вось такі лакальны суцэльны дэфіцыт у адной асобна ўзятай вёсцы ў адну асобна ўзятую суботу. Прычым выпадак не адзінкавы, а хутчэй для гэтай мясцовасці тыповы. Ну не пашанцавала вёсцы апынуцца на краі раёна, самым апошнім пунктам на маршруце аўтакрамы. Усё разбіраюць там, куды яна заязджае раней, асабліва ўлетку, калі вясковае насельніцтва за кошт дачнікаў павялічваецца ў разы. Людзі ўжо да гэтага прывыклі, тым больш што ў панядзелак прыязджае іншая аўтакрама — прыватная, і там можна купіць што хочаш, нават вэнджаны кумпяк і баваўняныя шкарпэткі. Але ўсё роўна ў той суботняй незадаволенай чарзе дзесьці намёкам, а дзесьці і прамым тэкстам гучыць: «Што вы хочаце, гэта ж дзяржаўны гандаль. Каб што лепшае!..»

НЯДАЎНА пазванілі абураныя чытачы з іншага раёна. Расказалі: знаходзяцца з вучнямі ў школьным летніку. Там каля двухсот дзяцей з усяго раёна адпачываюць, спаборнічаюць, гуляюць. Адпаведна, на поўным пансіёне — як мінімум чатырохразовае харчаванне. Як ядуць дзеці — самі ведаеце. Адзін не ўпадабаў тое, іншы гэта. Карацей, адходаў харчовых ад двухсот чалавек хапае. У мінулыя гады праблем не было: кухары, як правіла, мясцовыя жанчыны, забіралі тыя аб'едкі дадому. У каго куры, у каго свінчо, а калі што, дык і ў кампосную яму не шкодна выкінуць. Сёлета кухарам пад распіску строга забаранілі выносіць з лагера хоць грам якога прадукту, нават недаедзенага. «Гэта ўсё зразумела, такім чынам хочуць прадухіліць крадзеж прадуктаў ад дзяцей. І гэта варта падтрымліваць, — казалі мне чытачы (прычым званіў не адзін, па гучнай сувязі ў размове ўдзельнічалі некалькі чалавек). — Але ж не трэба даходзіць да маразму. Калі ўжо забаранілі выносіць тыя аб'едкі, дык прыдумайце спачатку, як іх нармальна ўтылізаваць. А так тыя недаедзеныя катлеты і супы адправіліся ў звычайныя смеццевыя кантэйнеры побач з лагерам. Гэта ж не горад, па смецце кожны дзень ніхто не паедзе. На вуліцы спёка, кантэйнеры поўныя стаяць... Уявіце, які «водар» ад іх. Не кажучы ўжо пра якую заразу, што лёгка можа тут з'явіцца. Вось так і жывём. Што за сістэма!»

Я наўмысна не ўказваю дакладнае месца дзеяння (хаця, калі хтосьці з адказных асоб зацікавіцца, паведамлю пра лакацыю ва ўсіх падрабязнасцях). Бо няважна, дзе менавіта адбываецца падобнае, — тое, чаго не павінна адбывацца ў прынцыпе. Важна іншае, і пра гэта трэба не маўчаць. У вачах людзей у тым, што прывезлі адзін пачак солі на ўсю вёску, вінаваты не супрацоўнік раённай спажыўкааперацыі, у абавязкі якога ўваходзіць сачыць за наяўнасцю і асартыментам тавараў і які з гэтымі абавязкамі ніяк не спраўляецца. Вінавата дзяржава, улада, сістэма, калі хочаце. Ад абураных педагогаў, якія разам з дзецьмі вымушаны дыхаць смуродам, у канцы эмацыянальнай размовы гучыць: «Што за сістэма!» Вінаватыя, заўважце, не дурні, якія ў адным асобна ўзятым лагеры гэту смярдзючую кашу заварылі, і не падумалі, і не прынялі мер, каб яе кудысьці своечасова вывезці, — вінавата «сістэма».

Так і атрымліваецца. Кіраўніцтва краіны робіць усё магчымае, каб яе захаваць, каб мы не адчувалі санкцый, каб у нас была работа і за што купіць паесці і заплаціць за кватэру. Клапоцячыся пра ўсё гэта для кожнага з нас, кіраўніцтва краіны просіць нас аб адным: кожны на сваім месцы павінен якасна рабіць сваю справу. Не проста адбываць прызначаныя гадзіны, а якасна рабіць. Гэта значыць, уключаць мазгі, думаць, аналізаваць, мець на ўвазе наступствы, якія твае дзеянні або бяздзейнасць пацягнуць. Думаць не толькі пра ўласны спакой (абы ніхто не чапаў), але і пра сваю ролю (як ні патэтычна гэта гучыць) у дабрабыце сваёй краіны. Занадта шмат, аказваецца, у нас просяць? А што вы хочаце — час такі. І заўтра гэтыя недавезеныя па чыёйсьці дурасці некалькі пачкаў солі — з адпаведным «інфармацыйным забеспячэннем» у сацыяльных сетках — могуць стаць трыгерам для масавых беспарадкаў. Прыкладаў падобных у сусветнай гісторыі хапае...

ЕХАЛА сёння ў тралейбусе на працу, з жалем глядзела на каштаны абапал вуліцы, якія з зялёных ужо сталі ржава-рудыя, — на гэтыя дрэвы ў сталіцы ўжо каторы год нападае нейкая зараза і псуе лісце ад пачатку лета. Эколагі і навукоўцы кожны год рапартуюць, што ўжо нешта прыдумалі, каб з заразай змагацца. Далей рапартаў, мяркуючы па ўсім, справа так і не пайшла. І раптам чую з суседняга сядзення дзве кабеты: «Ты глянь, зноў каштаны пасохлі. Нікому і справы няма. Што за ўлада, што за сістэма...» Як вам — «каштанавая рэвалюцыя»? Смешна? А калі падумаць — дык і не надта.

ЯКАСНА і адказна рабіць сваю справу на сваім месцы. Няшмат, здаецца, у нас просяць. Як па сённяшнім часе — дык зусім-зусім няшмат.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Надвор'е

ДАЖДЖЫ, НАВАЛЬНІЦЫ І ЗНОЎ ДАЖДЖЫ

А ў сераду — бясхмарнае лета і пад 30

Здавалася б, за ўвесь чэрвень дажджы былі рэдкімі гасцямі ў нашай краіне. У той жа час на апошнім тыдні першага летняга месяца, дзякуючы магутным цыкланічным віхрам, колькасць ападкаў прыкметна павялічылася. І ў апошні дзень чэрвеня будуць ісці дажджы, але чакаюцца яны ў асноўным па ўсходняй палове краіны, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Такім чынам, у пятніцу пераважна па ўсходняй частцы Беларусі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Днём пры навальніцах месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Максімальная тэмпература паветра будзе ў межах ад плюс 20 градусаў па ўсходзе да плюс 27 градусаў у заходніх раёнах краіны.

Паводле слоў сіноптыкаў, ліпень прыме эстафету ў свайго папярэдніка разам з дажджлівым надвор'ем. У суботу ўначы месцамі па захадзе, раніцай і днём — на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 10 градусаў да 16 цяпла, а ўдзень — ад плюс 19 градусаў на паўночным захадзе да плюс 28 градусаў на паўднёвым усходзе.

У нядзелю ноччу месцамі, а днём на большай частцы нашай тэрыторыі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Уначы тэмпература дасягне 8—15 градусаў цяпла, а па паўднёвым усходзе — да 17 цяпла. Удзень чакаецца 19—26 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, пагрымяць навальніцы. Уначы прагназуецца плюс 9—16 градусаў, а ўдзень — 21—28 градусаў цяпла. У аўторак месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Уначы слупок тэрмометра дасягне плюс 9—16 градусаў, а ўдзень — плюс 22—29 градусаў.

А ў сераду сіноптыкі чакаюць выключна гарачае сонечнае надвор'е. У гэты дзень будзе пераважна без ападкаў. Уначы чакаецца 10—17 цяпла. Днём паветра прагрэецца да 23—30 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.41	21.45	17.04
Віцебск —	4.21	21.43	17.22
Магілёў —	4.31	21.35	17.04
Гомель —	4.37	21.22	16.45
Гродна —	4.58	21.58	17.00
Брэст —	5.08	21.50	16.42

Месяц

Першая квадра 26 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Мануіла, Савацій, Савелія.*
К. *Гертруды, Люцыны, Эмілій, Арнольда, Кірыла, Раймонда, Уладзіслава, Эрнэста.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

30 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1881 год — нарадзіўся Павел Андрэевіч Растаргуеў, беларускі і расійскі мовазнаўца, педагог, сапраўдны член Інбелкульта, доктар філалагічных навук, прафесар. У 1918-м чытаў курс лекцый па беларускай мове ў Беларускім народным універсітэце ў Маскве. Працаваў у Навазыбкаўскім педагагічным інстытуце, у Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН Беларусі. Даследаваў гісторыю і дыялекталогію ўсходнеславянскіх моў, беларускія гаворкі, праблемы беларускай літаратурнай мовы.

1898 год — у Віцебску быў пушчаны першы ў Беларусі трамвай на электрычнай цязе. Трамвайны парк складалі 18 маторных і 16 прычапных трамвайных вагонаў, працягласць трамвайных ліній — 5,1 кіламетра.

1958 год — нарадзіўся Васіль Фёдаравіч Якуша, беларускі спартсмен (акадэмічнае веславанне), майстар спорту СССР, майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту СССР. У 1992—1997 гг. — галоўны трэнер па акадэмічным веславанні СКА (Мінск). Сярэбраны прызёр XXII Алімпійскіх гульняў (1980), бронзавы прызёр XXIV Алімпійскіх гульняў (1988). Сярэбраны прызёр чэмпіянату свету (1982), бронзавы прызёр чэмпіянату свету (1986).

У свеце

1748 год — нарадзіўся Жан-Дамінік Касіні, французскі астраном і геадэзіст, стваральнік першага поўнага атласа Францыі.

1908 год — над шырокай тэрыторыяй Цэнтральнай Сібіры ў басейне ракі Падкаменная Тунгуска пры ўварванні ў шчыльныя слаі атмасферы на вышыні 10 кіламетраў упаў і выбухнуў гіганцкі метэарыт. У выніку выбуху магутнасцю, па некаторых ацэнках, больш за 40 мегатон была спустошана тэрыторыя ў дзве тысячы квадратных кіламетраў.

1941 год — рашэннем Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, ЦК УКП (б) і СНК СССР утвораны Дзяржаўны камітэт абароны (ДКА) пад старшынствам Іосіфа Сталіна — надзвычайны дзяржаўны орган у СССР, у якім у гады Вялікай Айчыннай вайны была сканцэнтравана ўся паўната ўлады. Для інфармавання насельніцтва аб падзеях, якія адбываюцца на фронце і ў тыле, створана спецыяльнае Інфармбюро. ЦК УКП (б) прыняў дырэктыву № 1 «Аб пераходзе на падпольную работу партарганізацый раёнаў, занятых ворагам», а на наступны дзень — дырэктыву № 2 «Аб разгортванні ўзброенай партызанскай вайны ў тыле ворага».

1948 год — нарадзілася Галіна Аляксееўна Калініна, расійская спявачка, народная артыстка РСФСР.

Так гаварыў...

РЫГОР БАРАДУЛІН:

«Сумленне, як ласку матчыну,
Не купіш і ў складчыну».

УСМІХНЕМСЯ

— Што вы робіце, калі ў вас з'яўляюцца грошы?

— Ну так адразу і не ўспомніш...

Парады мужчынам. Выпіце перад сном тры-пяць літраў піва. Апухлы твар раніцай лягчэй галіць!

На пяты дзень дыеты пачаліся сны сексуальнага характару: вялікі пакой... я ляжу ў ванне... напоўненай баршчом...

У зоамагазіне.

— А чаму гэтая чарапашка каштуе дзвесце рублёў, а гэтая трыста? Яны ж абсалютна аднолькавыя...

— Гэтая пражыве ў вас дзвесце гадоў, а гэтая — трыста.

— А-а, зразумела...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звядзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.436. Індэкс 63850. Зак. № 1397.

Нумар падпісаны ў 19.30 29 чэрвеня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12